Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 27 (239) | Пятніца, 2 снежня 1955 года. | Цана 20 кап.

ПОД ЗНАМЕНЕМ МАРКСА-ЭНГЕЛЬСА-ЛЕНИНА-СТАЛИНА, ПОД РУКОВОДСТВОМ КОММУНИСТИЧЕСКОЙ ПАРТИИ — ВПЕРЕД, К ПОБЕДЕ КОММУНИЗМА!

ДЗЕВЯТНАЦЦАЦЬ год назад VIII Надзвычайны Усесаюзны з'езд Саветаў прыняў новую Канстытуцыю Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Гэтая падзея азнаменавала сабой уступленне СССР у новую паласу развіцця, у паласу завяршэння будаўніцтва сацыялістычнага грамадства і паступовага пераходу ад сацыялізма да камунізма.

Канстытуцыя СССР ярка дэманструе нязмерную перавагу сацыялістычнага грамадскага ладу і сацыялістычнай дэмакратыі над гніючым ладам капіталізма, над фальшывай буржуазнай дэмакратыяй.

Усе буржуазныя канстытуцыі замацоўваюць эксплуататарскія правы капіталістаў і памешчыкаў. Яны зыходзяць з пераканання аб непарушнасці буржуазнага ладу. Галоўную аснову буржуазных канстытуцый складаюць прызнанне і ахова прыватнай уласнасці на зямлю і сродкі вытворчасці.

Канстытуцыя СССР зыходзіць з прызнання факта ліквідацыі капіталістычнага і перамогі сацыялістычнага ладу, перамогі сацыялістычнай сістэмы гаспадаркі, ліквідацыі эксплуататарскіх класаў. У нас існуюць два дружалюбныя класы—рабочых і калгаснага сялянства, кіруючая роля належыць рабочаму класу, як перадавому класу грамадства.

Толькі з ліквідацыяй капіталізма і ўстанаўленнем дыктатуры пралетарыята працоўныя могуць шырока карыстацца дэмакратычнымі правамі, быць удзельнікамі ў кіраванні дзяржаўнымі справамі.

Саветы дэпутатаў працоўных у СССР і органы народнай дэмакратыі ў народна-дэмакратычных краінах—законныя прадстаўнікі народа, бо яны з'яўляюцца ўладай самога народа. Сапраўднае народаўладдзе там, дзе сам народ, самі працоўныя кіруюць сваёй дзяржавай.

У капіталістычных краінах працоўныя масы не могуць аказваць уплыў на вырашэнне дзяржаўных спраў. Эксплуататарскія класы, выкарыстоўваючы сваю эканамічную магутнасць, друк, рэлігію і іншыя ідэалагічныя сродкі, замацоўваюць сваё палітычнае панаванне.

Многія канстытуцыі капіталістычных краін пазбаўляюць выбарчых правоў жанчын. У Партугаліі, напрыклад, выбарчымі правамі не карыстаюцца ўсе замужнія жанчыны; канстытуцыя Калумбіі пазбаўляе выбарчых правоў усіх жанчын, ставячы іх у адзін рад з алкаголікамі.

Буржуазныя канстытуцыі зыходзяць з таго, што нацыі і расы не могуць быць роўнапраўнымі. У 14 штатах ЗША негры фактычна пазбаўлены выбарчых правоў, а яны складаюць 13—14 мільёнаў чалавек. Па канстытуцыі Бельгіі, каб мець права быць выбраным, трэба быць бельгійцам па нараджэнню або атрымаць поўную натуралізацыю. Народы калоній маюць яшчэ менш правоў, чым няроўнапраўныя нацыі. Усе буржуазныя канстытуцыі ў аснове сваёй з'яўляюцца нацыяналістычнымі, г. зн. канстытуцыямі пануючых класаў вялікадзяржаўных нацый.

Канстытуцыя СССР глыбока інтэрнацыянальная. Яна законадаўча замацоўвае роўнапраўнасць прадстаўнікоў усіх нацый і народнасцей, насяляючых Совецкі Саюз. У совецкіх рэспубліках—раней адсталых краінах царскай Расіі, пабудавана магутная індустрыя, буйная сацыялістычная сельская гаспадарка, расквітнела сацыялістычная па зместу і нацыянальная па форме культура. Яркім прыкладам перамогі нацыянальнай палітыкі Комуністычнай партыі з'яўляецца росквіт эканомікі і культуры Беларускай ССР. У нашай рэспубліцы пабудаваны аўтамабільны, трактарны, станкабудаўнічыя і іншыя заводы. Няспынна ідзе ўгору і развіваецца сельская гаспадарка Беларусі. Павялічваецца колькасць вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, школ, бібліятэк, кінотэатраў і іншых культурна-асветных устаноў. Яркім прыкладам развіцця беларускай сацыялістычнай культуры з'яўляецца растучы з году ў год наш універсітэт.

Вядома, што да Кастрычніцкай рэволюцыі ў Беларусі не было ніводнай вышэйшай навучальнай установы. Цяпер толькі ў адным Мінску працуе 11 вышэйшых навучальных устаноў. У 1921 годзе па рашэнню Совецкага ўрада быў адкрыт Беларускі дзяржаўны універсітэт. Ён налічваў на ўсіх факультэтах 1390 студэнтаў. Ва універсітэце працавала ўсяго 14 навуковых работнікаў, якія мелі вучоныя ступені і званні. Цяпер у нашым універсітэце працуе 235 навуковых работнікаў, з іх 32 прафесары і дактары навук, 103 дацэнты і кандыдаты навук. Ва універсітэце навучаецца каля 6 тысяч студэнтаў.

Канстытуцыя СССР мае вялікае міжнароднае значэнне. Яна асвятляе шлях барацьбы працоўных капіталістычных краін, усяляючы ўпэўненасць у канчатковай перамозе комунізма ва ўсім свеце.

Дзевятнаццатую гадавіну прыняцця новай Канстытуцыі працоўныя СССР сустракаюць новымі перамогамі ў будаўніцтве комунізма. Папярэднія вынікі 1955, апошняга года пятай пяцігодкі, гавораць аб тым, што пяцігадовы план не толькі выконваецца, але і перавыконваецца па важнейшых паказчыках. Па аб'ёму валавой прадукцыі заданне плана выканана да 1 мая 1955 года, г. зн. за 4 гады і 4 месяцы. За дзве пасляваенныя пяцігодкі ўзровень прамысловасці СССР узрос, у параўнанні з 1940 годам, больш чым у тры разы. Асабліва хутка развіваецца цяжкая прамысловасць.

Значных поспехаў дабіўся совецкі народ у развіцці сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Працоўныя нашай краіны паспяхова выконваюць заданне партыі і ўрада па ўздыму цалінных і абложных зямель. У гэтым годзе ў краіне сабрана збожжа значна больш, чым у мінулым. Сацыялістычная прамысловасць няспынна забяспечвае сельскую гаспадарку навейшай тэхнікай.

На аснове развіцця сацыялістычнай вытворчасці няўхільна расце рэальная заработная плата рабочых і служачых, даходы калгаснікаў. З кожным днём павышаецца матэрыяльны добрабыт совецкага народа.

Працоўныя Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі з кожным днём дабіваюцца ўсё новых поспехаў у будаўніцтве комунізма ў нашай краіне, у барацьбе за мір і дэмакратыю ва ўсім свеце.

Г. С. МАХАНЁК,
кандыдат гістарычных навук.

135-годдзе з дня нараджэння Ф. Энгельса

28 лістапада споўнілася 135 год з дня нараджэння вялікага генія чалавецтва, друга і паплечніка Карла Маркса, Фрыдрыха Энгельса.

Кабінет палітычнай эканоміі універсітэта арганізаваў да гэтай даты выстаўку ілюстрацый, выразак, фотаздымкаў і выдатных работ Энгельса: «Анты-Дзюрынг», «Дыялектыка прыроды», «Сялянская вайна ў Германіі», «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы» і інш. Акрамя таго, тут прадстаўлена перапіска Маркса з Энгельсам і работа Леніна «Фрыдрых Энгельс». На выстаўцы ілюструюцца пісьмы Энгельса рускім рэволюцыянерам, пісьмы Ф. Энгельса Г. В. Плеханаву (26 лютага 1895 г.), Н. Ф. Дэнельсону (1885—1895 гг.), В. І. Засуліч (ад 23 красавіка 1885 г.), П. Л. Лаўрову (1875—1884 гг.) і М. К. Закаблукавай (ад 5 жніўня 1880 г.).

Н. ЯРАВІКОЎ,
заг. кабінетам палітэканоміі.

КУЛЬТПАХОД СТУДЭНТАЎ

Студэнты другой групы I курса юрыдычнага факультэта правялі культпаход у дом-музей І з'езда партыі і музей Вялікай Айчыннай вайны. У доме-музеі экскурсавод т. Магідава падрабязна расказала нам аб рэвалюцыйным руху ў Расіі ў канцы XIX і пачатку XX веку, аб умовах, у якіх праходзіла работа І з'езда партыі. У музеі Вялікай Айчыннай вайны мы яшчэ лепш уявілі сабе карціну гераічнай барацьбы совецкага народа, падрабязней даведаліся аб умовах барацьбы беларускіх партызан. Мы бачылі многія дакументы, якія пацвярджаюць гераізм гэтай барацьбы.

Несумненна, гэты калектыўны паход узбагаціў нашы веды, даў нам многа карыснага.

В. ЗАРАГАЦКІ,
студэнт I курса юрфака.

АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫЙ

Нядаўна на пасяджэнні аб'яднанага Вучонага совета хімічнага і фізіка-матэматычнага факультэтаў аспірант В. Свірыдаў абараніў дысертацыю на тэму: «Даследаванне ўплыву папярэдняга абпраменьвання на тэрмічны распад цвёрдых рэчываў».

Таксама на пасяджэнні Вучонага совета дысертацыю на тэму: «Рашэнне змешанай задачы для гіпербалічных сістэм на плоскасці метадам сетак» паспяхова абараніў аспірант фізіка-матэматычнага факультэта А. Лепін.

Маладым вучоным прысвоена ступень кандыдатаў хімічных і фізіка-матэматычных навук. Калектыў вучоных універсітэта папоўніўся новымі сіламі.

На здымку: малады вучоны В. Свірыдаў.

ВЕЧАР, ПРЫСВЕЧАНЫ АДАМУ МІЦКЕВІЧУ

У клубе БДУ імя В. І. Леніна адбыўся літаратурна-музычны вечар-канцэрт, прысвечаны 100-годдзю з дня смерці Адама Міцкевіча.

Уступнае слова прадастаўляецца студэнту-паляку Шыману Раманчуку. Ён гаворыць аб той бязмежнай любві, якой карыстаюцца творы Адама Міцкевіча ў Польскай народна-дэмакратычнай рэспубліцы.

Горача былі сустрэты выступленні польскіх студэнтак Веры Паўлоўскай і Любы Філіпік. Яны прачыталі на польскай мове вершы Адама Міцкевіча.

З цікавасцю праслухалі сабраўшыяся даклад кандыдата філалагічных навук Д. Е. Фактаровіча аб жыццёвым і творчым шляху Адама Міцкевіча.

У заключэнне быў дадзен канцэрт сіламі артыстаў Беларускай дзяржаўнай эстрады. Артыстка Лідзія Маркалёва прачытала некалькі вершаў і балад Адама Міцкевіча на рускай, беларускай і польскай мовах. Салістка Клаўдзія Ясінская выканала рамансы Глінкі, Чайкоўскага на словы Адама Міцкевіча. Малады беларускі кампазітар Генрых Вагнер выканаў некаторыя фартэпіянныя творы Шапэна.

І. ЦІШЧАНКА.

НА АГЛЯДЗЕ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

У памяшканні Акруговага дома афіцэраў адбыўся заключны канцэрт мастацкай самадзейнасці прадпрыемстваў і ВНУ г. Мінска. Шырокай праграмай была прадстаўлена мастацкая самадзейнасць нашага універсітэта.

Універсітэцкі хор выканаў беларускія народныя песні «Ой, на гары пшаніченька», «Пайду, пайду, Ясю мілы», украінскую народную песню «Сусідка» і інш.

Цікавым было выступленне домра-балалаечнага аркестра універсітэта.

П. КАЗАЧОНАК.

ВУЧОНЫЯ УНІВЕРСІТЭТА— СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ

Як вядома, узбуджальнікі хвароб раслін прыносяць вялікія страты сельскай гаспадарцы. Дастаткова ўказаць, што вельмі часта не менш чвэрці ўраджаю гіне ў выніку развіцця хвароб. Напрыклад, штогодны недабор ураджаю бульбы ў БССР складае мільёны цэнтнераў. Вось чаму вывучэнне ўзбуджальнікаў хвароб раслін і распрацоўка спосабаў барацьбы з імі мае найважнейшае значэнне для атрымання высокага і ўстойлівага ўраджаю.

Калектыў кафедры сістэматыкі раслін накіроўвае свае намаганні галоўным чынам на распрацоўку спосабаў барацьбы з узбуджальнікамі хвароб бульбы, цукровых буракоў, канюшыны, кукурузы і лубіну.

У гэтым годзе намі апублікавана манаграфія Н. А. Дарожкіна «Хваробы бульбы», у якой мы спрабавалі абагуліць матэрыялы даследаванняў, назіранняў і вопытаў, што праводзяцца намі ў Беларусі на працягу чвэрці веку. Распрацаваная сістэма мераприемстваў па барацьбе з хваробамі бульбы дазваляе павялічыць ураджай бульбы не менш як на 25 працэнтаў. Рад распрацаваных кафедрай мерапрыемстваў пры нашай кансультацыі ўкараняюся ў калгасы Мінскага, Старадарожскага, Слуцкага, Капыльскага і іншых раёнаў Мінскай вобласці.

У гэтым годзе намі здадзена ў друк брашура «Аб мерах барацьбы з хваробамі цукровых буракоў». Гэтая работа напісана на аснове праведзеных кафедрай даследаванняў. Старшы выкладчык—кандыдат біялагічных навук В. К. Гаравец — апублікавала артыкул у дапамогу калгасным аграномам па барацьбе з хваробамі цукровых буракоў.

Асістэнт кафедры З. Н. Кудрашова заканчвае даследаванні па вывучэнню біялогіі ўзбуджальніка антракноза канюшыны і распрацоўцы спосабаў барацьбы з ім. Яе даследаванні будуць мець вялікае значэнне ў павышэнні ўраджайнасці сена, а таксама і насення канюшыны.

У гэтым годзе пачаты даследаванні па вывучэнню ўзбуджальнікаў хвароб кукурузы. Ужо цяпер можна сцвярджаць, што сабраны па гэтаму пытанню матэрыял вельмі каштоўны для вывучэння біялогіі ўзбуджальніка. Дыпломныя работы студэнтаў V курса Мяцельскай, Чэрняўскай і Рагусскай прысвечаны вывучэнню ўзбуджальнікаў хвароб раслін.

Супрацоўнікі кафедры аказвалі практычную дапамогу раду калгасаў у правядзенні веснавой сяўбы, па догляду за пасевамі, а таксама выступалі на рэспубліканскіх нарадах перадавікоў сельскай гаспадаркі і аграномаў. Акрамя таго мы выступалі з навуковымі дакладамі на Усесаюзных нарадах у Кіеве і Ленінградзе.

Аднак мы разумеем, што намі далёка не ўсё зроблена, і ў далейшым будзем стараццa працаваць так, каб аказваць яшчэ большую дапамогу калгасам.

Н. А. ДАРОЖКІН.
прафесар.

Партыйнае жыццё

Добрыя намеры і нязначныя вынікі

На абмеркаванне партыйнага сходу, які нядаўна адбыўся на хімічным факультэце, было вынесена важнае жыццёвае пытанне: аб паляпшэнні выкладання марксізма-ленінізма. Партыйнае бюро хімфака здолела падабраць надзённую тэму. Якім шляхам дабіцца грунтоўнага засваення студэнтамі грамадскіх навук? Што ў гэтым напрамку могуць і павінны зрабіць выкладчыкі, самі студэнты? Усе гэтыя пытанні знайшлі ўсебаковае асвятленне ў дакладзе дацэнта В. І. Сцяпанава. Тут было сказана і аб значэнні марксізма-ленінізма ў практычным жыцці чалавека, і аб асаблівай неабходнасці ведання студэнтамі законаў грамадскага жыцця, і аб канкрэтных задачах партыйнай арганізацыі ў справе паляпшэння выкладання гэтай дысцыпліны. Больш таго, дакладчык сабраў і абагуліў багаты матэрыял аб тым, як канкрэтна вывучаюць студэнты факультэта грамадскія навукі, з якімі цяжкасцямі сустракаюцца. Былі ўскрыты і прааналізаваны недахопы ў самастойнай рабоце студэнтаў над першакрыніцамі, пры канспектаванні, дан шэраг карысных парад для ліквідацыі гэтых недахопаў.

Многа каштоўных выказванняў было зроблена і выступіўшымі ў спрэчках тт. Гракавым, Хрыпко, якія непасрэдна звязаны са студэнцкімі групамі і маюць багаты фактычны матэрыял. Добрае ўражанне засталося ў прысутных ад выступлення сакратара партбюро т. Паўлючэнкі.

Усё-ж, хоць быў змястоўны даклад, грунтоўныя выступленні ў спрэчках, добра складзена рэзалюцыя, партыйны сход не дасягнуў той мэты, якая перад ім стаяла. Чаму-ж так здарылася? А справа ў тым, што партыйнае бюро не падумала загадзя аб належнай падрыхтоўцы да сходу. Праўда, мелася на ўвазе запрасіць выкладчыкаў грамадскіх навук, якія працуюць на факультэце, комсамольскі і прафсаюзны актыў, староста студэнцкіх груп. Як відаць, былі добрыя намеры. Але не больш за гэта. На справе атрымалася такое становішча, што тых, аб кім гаварылі, дзеля каго збіраліся, не было на сходзе, калі не лічыць тав. Хрыпко, якая вядзе практычныя заняткі па асновах марксізма-ленінізма на факультэце, і сакратара комсамольскага бюро 1-га курса тав. Якаўлевіча.

Таму зусім заканамерна, што на сходзе не было чуваць голасу студэнтаў. А яны больш, чым хто-небудзь іншы, маглі-б расказаць, як вывучаюцца ў групах грамадскія дысцыпліны, якія сустракаюцца цяжкасці, якая дапамога ад выкладчыкаў неабходна ім.

У дакладзе гаварылася аб індывідуальным падыходзе да кожнага студэнта. А на сходзе нават не высветлілася становішча ў групах, бо выкладчыкі грамадскіх навук, што працуюць у іх, адсутнічалі і, вядома, не маглі выказаць свае думкі.

Апрача гэтага, да выкладчыкаў, якія іменна павінны паляпшаць выкладанне марксізма-ленінізма, не дайшло ўсё тое, што абмяркоўвалася на сходзе.

Добрыя намеры партыйнага бюро далі нязначныя вынікі, бо ў даным выпадку нельга гаварыць аб дзейснасці прынятых рашэнняў.

Партыйны сход філфака

Днямі адбыўся адкрыты партыйны сход на філалагічным факультэце з павесткай дня: «Новыя вучэбныя планы і задачы партыйнай арганізацыі ў павышэнні вучэбна-выхаваўчай работы на факультэце». Даклад зрабіў дэкан філфака М. Г. Ларчанка. У спрэчках выступілі тт. Зярніцкі, Фактаровіч, Булацкі, Грышчанкова і іншыя.

Апрача комуністаў, на сходзе прысутнічала многа беспартыйных выкладчыкаў, студэнтаў.

В. КАЛЕНЧЫЦ.

Сатырычная газета хімікаў

Каля стэнда, дзе вісіць насценная газета хімічнага факультэта, сабралася вельмі многа студэнтаў. Вясёлыя жарты нясуцца з усіх бакоў.

— Ну і правільна нашай Касцюк папала, — гаворыць, стрымліваючы смех студэнтка чацвертага курса, бялявая дзяўчына.— Яна-ж і на самай справе беларучкай стала.

— Нашаму Салдатаву не менш дасталося, — заўважаюць другакурснікі.

Кожны нумар сатырычнай газеты «Хромавая сумесь» студэнты сустракаюць з вялікай радасцю. А газета выходзіць заўсёды цікава, суправаджаецца вельмі вялікай колькасцю карыкатур, змяшчаюцца тут эпіграмы, невялікія вершаваныя фельетоны і сатырычныя вершы. Яна дапамагае студэнтам змагацца за лепшую паспяховасць, за прыкладную дысцыпліну.

Я. ГОМАН.

ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

НА ПРОСЬБЫ НЕ ЗВЯРТАЮЦЬ УВАГІ

Каб падрыхтавацца да семінара па палітэканоміі, я пайшоў нядаўна ў кабінет, дзе знаходзіцца літаратура па гэтай дысцыпліне. Прашу лабаранта Нікалая Арцём'евіча Яравікова выдаць мне «Капітал» К. Маркса і працу Леніна «Развіццё капіталізма ў Расіі». Нікалай Арцем'евіч адкрывае перапоўненую шафу, дастае адтуль дзесяткі кніг, брашур.

— Даводзіцца, як бачыце, траціць нямала часу на адшуканне патрэбнай кнігі, — нявесела ўсміхаецца Нікалай Арцем'евіч і працягвае:

— Некалькі разоў я звяртаўся да прарэктара гаспадарчай часткі універсітэта тав. Бярэзіна з просьбай купіць для кабінета палітэканоміі хаця-б адну шафу. Тав. Бярэзін, нажаль, адмаўляе на заявы. А кабінету палітэканоміі патрэбна не адна, а некалькі шафаў для размяшчэння літаратуры. Гэта бачыць кожны, хто заходзіць працаваць у кабінет.

Пара заўважыць гэта і тав. Бярэзіну, каб задаволіць просьбу лабаранта.

А. ІЛЬЮКОЎ.

ЧАЛАВЕКА І ЯГО ПРАЦУ ТРЭБА ПАВАЖАЦЬ

У машыннае бюро універсітэта прышоў намеснік дэкана фізіка-матэматычнага факультэта тав. Кіслякоў з матэрыяламі для тэрміновага друкавання,—табліцамі з лічбовымі данымі. Многія з гэтых табліц складаліся з асобных лістоў з несупадаючымі графамі. Для таго, каб іх можна было друкаваць, мы прасілі падклеіць матэрыял або дыктаваць, інакш машыністцы цяжка заглядваць то ў адну паперу, то ў другую, і работа не будзе пазбаўлена памылак. На нашу зусім справядлівую просьбу тав. Кіслякоў адказаў: Не магу больш слухаць, даволі! Вы толькі халтурай займаецеся!» І выхавацель моладзі пайшоў, грукнуушы дзвярыма.

Сваімі абураючымі паводзінамі тав. Кіслякоў вывеў увесь наш калектыў з роўнавагі і пасля яго наведвання ніхто не мог нармальна працаваць.

Які-ж тав. Кіслякоў выхавацель моладзі, калі ён сам дрэнна выхаваны? Упершыню нам давялося сутыкнуцца з такім зазнаўшымся, грубым маладым чалавекам, не паважаючым людзей і іх працу.

Р. ЛЕЙЗЕРОВІЧ,
В. СЕНКЕВІЧ,
Н. ХІТРЫНА,
М. СТАЦЭВІЧ.

Фельетон

Ходзяць ногі не туды...

Не! Не шумеў тады камыш, не гнуліся дрэвы і ночка была зусім светлай. Між тым на фоне зарава электрычных агнёў стадыя ап'янення ў студэнта трэцяга курса юрфака Віктара Барсукова дасягала кульмінацыі.

І віною ва ўсім былі ўласныя ногі. Чаму ногі, а не галава? Іменна не галава, а ногі. Галава бяздзейнічала, а ногі так насілі яго ў гэты вечар, што прахожыя проста дзівіліся, гледзячы на будучага работніка, якому прадстаіць ахоўваць законныя правы совецкіх грамадзян.

Гэта былі не ногі, а штосьці нагадваючае крылоўскае «Однажды лебедь, рак да щука везти с поклажей воз взялись». І калі мы ўявім такое: лебедзь,—галава, рак—левая нага, шчупак—правая нага, дык... Што «дык»? А вось што! Калі левая нага рабіла спробу ступіць уперад, правая нага закручвала «васьмёрку» і як мага паўзла назад, у выніку чаго ўвесь цяжар хмелю перамяшчаўся ў галаву і яна (бедная галава!) падала на цвёрды асфальт. Не думайце толькі, што яна так проста і падала. А нос? Забыліся мы пра яго. А каму-ж, як не яму, больш за ўсё дасталося? Толькі падумаць! Ён распух і застаўся без скуры....

Нягледзячы на ўсё, Барсукоў вельмі ўдала даваў рыкашэты, калі галава ляцела ўніз, таму доўга і не залежваўся на адным месцы, а мог поўзаць па ўсім горадзе.

Напаткаў ён неяк тэлеграфны слуп. І што вы думаеце? Разагнаўся і ўступіў у бой.

— Ты хто такі, што стаіш на маёй дарозе? Прэч!—закрычаў Барсукоў. Але слуп заставаўся слупам і не падаваў ніякіх азнак жыцця.

—Я... Я... Не ведаеш, хто я? Юрыст! Вось хто я! Усе законы ведаю! Не хочаш? Тады атрымлівай!—і рука на ўсю моц, пляснула па жалезу.

Але гэта было не вельмі прыемна, а нават крыху балюча, і будучы юрыст пакінуў слуп і накіраваўся ў гасцініцу «Беларусь».

Там адбылося тое, што і павінна было адбыцца. Не падумайце толькі, што ён закупіў месца і лёг спаць. Не! Дзверы вельмі цяжка адчыняліся і ён у іх ударыў рукой. Не бярэ! Толькі рука баліць. Разагнаўся і нагою—трах-тара-рах у вялізную шыбу, а тая дзын-дзын... і рассыпалася.

— Малады чалавек! Заплаціце грошы за шыбу,—звярнуліся да яго работнікі гасцініцы.

— Бачыш, чаго захацелі? А вы не ведаеце, што паводле інструкцыі № 978 ад 49 кастрычніка 1807 года ўсе юрысты не нясуць адказнасці за зробленыя імі ўчынкі? Каціцеся ад мяне...

Так закончылася адна з чарговых і шматлікіх прыгод студэнта-юрыста.

Зусім нядаўна ў рэстаране, што на фабрыцы-кухні, здарылася яшчэ і не такое. Рыцар начных паходжанняў Барсукоў хацеў выкарыстаць зброю. Але, трапіўшы ў небяспеку, падняў рукі ўгору і падпісаў акт аб сваёй капітуляцыі.

— Навошта вы носіце вогнястрэльную зброю?—запыталіся ў яго.

— Дзівакі! Падабаецца мне гэтая «штука» і нашу яе! На ўсякі выпадак пісталет можа спатрэбіцца,—адказаў студэнт голасам нявіннай авечкі.

Калі хто-небудзь і запытае, як гляджу на гэта комсамольская арганізацыя юрыдычнага факультэта, дык можна адказаць: яго выключылі з радоў ВЛКСМ. Выключылі, а ён рад, што ўжо цяпер яму ніхто не зможа намыліць шыю за шматлікія дэбашырскія ўчынкі, і спакойна, хаця і не часта, ходзіць на лекцыі ва універсітэт. Адным словам, і ўдзень, і уночы ён вельмі любіць хадзіць. Але ўсе кажуць, што яго ногі ходзяць не туды. Здаецца, што гэта і сапраўды так.

В. ЧАРЭШНЯ.

Парады выкладчыка

ЯК РЫХТАВАЦЦА ДА СЕМІНАРАЎ

Творчы характар марксізма-ленінізма патрабуе і творчага метаду вывучэння яго. А што значыць творчае авалоданне марксізмам-ленінізмам? Гэта не проста завучыць, запомніць тое або іншае марксісцка-ленінскае палажэнне. Гэтага яшчэ недастаткова. Неабходна навучыцца знаходзіць праламленне яго ў канкрэтнай рэчаіснаєці — у з'явах прыроды, у гісторыі чалавечага грамадства, у практычнай дзейнасці, у барацьбе працоўных. Многія-ж студэнты пры вывучэнні марксізма-ленінізма імкнуцца запомніць, хаця-б у агульных рысах, тое або іншае палажэнне марксісцка-ленінскай тэорыі, завучыць яго, а карыстацца ім у практычнай дзейнасці не могуць.

Самастойная работа студэнтаў — адно з важнейшых звенняў у творчым авалоданні марксізмам-ленінізмам. Як-жа арганізаваць яе, каб яна ў максімальнай ступені садзейнічала гэтаму?

Ведаючы расклад заняткаў, студэнт можа і павінен спланаваць свой час так, каб пачаць падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў не ў апошні дзень напярэдадні семінара, а значна раней. За адзін вечар (4 — 5 гадзін) нават самы падрыхтаваны і здольны студэнт не зможа гэтага зрабіць. Акрамя таго, магчымы ўсялякія нечаканасці, якія могуць сарваць гэтую работу. На апошні дзень, у крайнім выпадку, можна адкласці кансультацыю па данай тэме.

Перш, чым прыступаць да вывучэння рэкамендаванай літаратуры, трэба азнаёміцца з планам семінарскіх заняткаў, каб ведаць на што галоўным чынам звяртаць увагу.

Вывучэнне літаратуры неабходна пачынаць з кароткага курса гісторыі партыі. Гэта дапаможа студэнту вылучыць галоўнае ў вывучаемых матэрыялах, разабрацца ў іх.

Усю рэкамендаваную літаратуру трэба не проста прачытаць, як гэта робяць некаторыя студэнты, а сур'ёзна прадумаць яе і канспектаваць. Канспект рэкамендуецца пісаць не ў працэсе чытання твору, а пасля таго, як уся літаратура прачытана, прадумана, засвоена. Тады канспект будзе цэласны, будзе карацей і паўней асвятляць вывучаемыя пытанні. У ім будзе запісана толькі тое, што непасрэдна адносіцца к данаму пытанню, і не з адной, а з усіх рэкамендаваных крыніц. Такі канспект лягчэй пісаць, ім лепш карыстацца, таксамка пры гэтым паўней і глыбей засвойваецца матэрыял.

Пры вывучэнні работ класікаў марксізма-ленінізма неабходна дабівацца яснага і канкрэтнага разумення, прымянення марксісцка-ленінскіх палажэнняў у грамадскім жыцці. Толькі пры такіх умовах накоплены фактычны матэрыял не будзе ляжаць бессэнсэмна мёртвым грузам у галаве студэнта, а з'явіцца жывой ілюстрацыяй вывучаемых марксісцка-ленінскіх палажэнняў. Глыбокае творчае разуменне такіх палажэнняў дапаможа студэнту з накопленых фактычных матэрыялаў зрабіць правільны вывад.

Вывучаючы літаратуру, студэнт не павінен пакідаць ніводнага незразумелага яму палажэння, ніводнага слова. Калі ён сам не разабраўся, не зразумеў іх, трэба звяртацца да кансультанта, кіраўніка семінара, або выкладчыка, які вядзе лекцыйны курс.

У кабінеце марксізма-ленінізма ёсць наглядныя дапаможнікі (карты, схемы, дыяграмы, плакаты і г. д.). Трэба шырока выкарыстоўваць і гэты матэрыял па кожнай тэме. Ён дапаможа замацаваць і расшырыць веды студэнта.

У падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў вялікае значэнне мае тое, наколькі студэнт ведае апошнія падзеі, унутраную і знешнюю палітыку Совецкага Саюза, краін Народнай Дэмакратыі, а таксама капіталістычных краін.

Неабходна прадумаць, у якой сувязі яны знаходзяцца з вывучаемай праблемай, што з іх можна выкарыстаць, каб наглядна паказаць з іх дапамогай тое або іншае палажэнне марксісцка-ленінскай тэорыі ў дзеянні. А гэта абавязвае студэнтаў рэгулярна чытаць газеты, часопісы, слухаць радыё, сачыць за жыццём нашай краіны і міжнародным жыццём. Нажаль, многія студэнты не чытаюць рэгулярна газет і часопісаў.

Пасля таго, як рэкамендаваная літаратура вывучана, вельмі карысна заглянуць у канспект лекцый па данай тэме, у якім асвятляецца большасць пытанняў семінарскіх заняткаў. Бяспрэчна, што студэнты, якія няўважліва адносяцца да лекцый, робяць вялікую памылку: яны зніжаюць якасць засваення імі марксісцка-ленінскай навукі, ускладняюць сваю падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў, да залікаў і экзаменаў.

Накапіўшы ў працэсе гэтай работы пэўны запас ведаў, рэкамендуецца зноў вярнуцца да плана семінарскіх заняткаў і сур'ёзна падумаць, што з накопленых ведаў і як выкарыстаць, каб усебакова і з дастатковай глыбінёй раскрыць пытанні, што стаяць у плане. Па адным, двух выбраных пытаннях можна скласці кароткі канспект свайго выступлення на семінары.

Кожны студэнт, скончыўшы універсітэт, стане спецыялістам у выбранай ім галіне. Але марксізм-ленінізм — такая навука, якая з'яўляецца абавязковай для спецыялістаў усіх прафесій. Не авалодаўшы хаця-б асновамі яе нельга паспяхова весці работу ні на адным з участкаў социялістычнага будаўніцтва, нельга паспяхова рухаць уперад ні адну з галін навукі. Аб гэтым павінен помніць кожны студэнт з першага дня паступлення у універсітэт і ўдзяляць самую сур'ёзную ўвагу вывучэнню марксісцка-ленінскай тэорыі.

Н. ГРАКАЎ.
кандыдат гістарычных навук.

ХУТКА ЭКЗАМЕНЫ. БЕРАЖЫ ВУЧЭБНЫ ЧАС!

ІДУЦЬ СЕМІНАРЫ

На ўсіх факультэтах універсітэта ідуць семінары па асновах марксізма-ленінізма, палітэканоміі і іншых дысцыплінах.

Як-жа праходзяць семінарскія заняткі ў групах факультэтаў і аддзяленняў?

... Алег Георгіевіч Ражкоў раскрыў журнал уліку студэнтаў I курса аддзялення фізікі (першая група фізіка-матэматычнага факультэта).

— Першым пытаннем, якое мы павінны разабраць на сённяшнім семінары, з'яўляецца «Маніфест Камуністычнай партыі» ў класавай барацьбе пролетарыята», — напомніў ён прыціхлай аудыторыі тэму заняткаў, і дадаў: — Хто першы, таварышы, адкажа на гэтае пытанне?

Адразу-ж падымаецца некалькі рук.

— Дазвольце мне, — нецярпліва ўстае са свайго месца Уладзімір Рубанаў.

Не спяшаючыся, дакладна выказваючы сваю думку, Уладзімір гаворыць аб задачах, пастаўленых перад камуністамі Марксам і Энгельсам.

Пасля яго выступае Уладзімір Аўсенеў.

Расказваючы аб слаўным шляху гераічнай барацьбы КПСС за справу рабочых і сялян, Уладзімір Аўсенеў гаворыць таксама і аб барацьбе за соцыялістычнае перабудаванне грамадства комуністычных партый краін народнай дэмакратыі.

Выступленне Аўсенева дапаўняюць другія студэнты. Але звініць званок. Хутка і цікава прайшла першая гадзіна семінара. За другую гадзіну студэнты падрабязна разабралі пытанне аб праграме і тактыцы Комуністычнай партыі.

У другакурснікаў хімічнага факультэта чарговы семінар па кнізе В. І. Леніна «Дзіцячая хвароба левізны ў комунізме» пачаўся як звычайна пачынаюцца ўсе семінары. Кіраўнік семінара Н. П. Хрыпко паўтарыла пытанне па тэме і назвала прозвішча.

Студэнтка Вялікая паднялася і, крыху запінаючыся, пачала расказваць аб міжнародным значэнні Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

— Цяпер разгранічце паняцці «міжнароднае значэнне рэволюцыі ў вузкім і шырокім сэнсе»,— запытала кіраўнік, калі студэнтка закончыла адказваць на пытанне.

У адказ некалькі звычайных фраз і зноў маўчанне. Дапамагчы сяброўцы бярэцца Яўгенія Сафроненка. Адчуваецца, што студэнтка разумее сутнасць пытання і таму ясна яго выкладае.

У другую гадзіну семінар крыху ажыўляецца. І вось ён закончан. Здаецца, ён прайшоў добра. Але ўсё-ж адчуваецца нейкая незадаволенасць. Чагосьці нестае. А нестае ў студэнтаў на семінарах актыўнасці. Ніхто з першакурснікаў не выступіў з дапаўненнем,ні ў каго не ўзнікла пытанняў. І гэта пасля ўмелай пастаноўкі т. Хрыпко дадатковых пытанняў.

Адсутнасць актыўнасці, творчага падыходу да вывучэння марксізма-ленінізма характэрна і для студэнтаў першай групы I курса аддзялення матэматыкі (кіраўнік семінарскіх заняткаў В. Г. Івашын). Тут чамусьці студэнты баяцца выпраўляць памылкі ў выступленнях таварышаў. Няма глыбіні разумення асобных пытанняў марксісцка-ленінскай навукі, няма творчага засваення.

Так, на адным з семінараў па кнізе В. І. Леніна «Што рабіць?» В. Г. Івашын вымушан быў адправіць з аудыторыі студэнта I курса аддзялення матэматыкі Дашкевіча. Перашкаджаючы адказваць другім, сам Дашкевіч не змог адказаць на пытанне выкладчыка.

Асобныя студэнты лічаць за непатрэбнае весці канспекты па першакрыніцах. Такая практыка заганная, бо даказана, што пры падобных адносінах да канспектавання работ класікаў марксізма-ленінізма студэнты маюць толькі неглыбокія веды.

Студэнт Карабёнак (першая група I курса фізмата) не канспектаваў ніводнага радка, а у сваіх выступленнях на семінарах ён не вызначаецца ведамі, не можа глыбока аналізаваць тыя або іншыя палажэнні марксізма.

В. МАЦКЕВІЧ,
В. ПАЎЛОВІЧ.



Студэнты I курса аддзялення геалогіі слухаюць курс лекцый па тапаграфіі і пад кіраўніцтвам выкладчыка В. М. Касцова займаюцца ў лабараторыі вывучэннем геадэзічных інструментаў, прыёмаў працы з імі.

На здымку: студэнты П. Паўлавец, В. Міснік, Б. Цырлінскі і І. Кандрусёў на практычных занятках па тапаграфіі.

Фота Л. Бондара.

Працаваць сістэматычна

Не адкладваючы справу на далей, я пачала падрыхтоўку да экзаменаў. Для гэтага я склала распарадак дня, а таксама план паўтарэння пройдзенага матэрыялу. Лекцыі мы звычайна слухаем да 2-х або да 4-х гадзін дня. Затым, пасля адпачынку і комсамольскай работы (я працую сакратаром бюро комсамольскай арганізацыі курса), іду ў чытальны зал, кабінеты ці лабараторыі працаваць самастойна.

Вялікую ролю ў падрыхтоўцы да экзаменаў адыгрываюць практычныя заняткі і семінары. Таму да іх я рыхтуюся асабліва старанна. Перад практычнымі заняткамі стараюся добра засвоіць тэарэтычныя палажэнні.

У нас, трэцякурснікаў, семінары адбываюцца па палітэканоміі. Рыхтуючыся да чарговага семінара, я канспектую «Капітал» і другія працы класікаў марксізма-ленінізма. Добра падрыхтаваўшыся, цікава і паспрачацца на семінарах, а ісціна, як кажуць, нараджаецца ў спрэчках.

Думаю, што сістэматычна паўтараючы пройдзены матэрыял, я змагу добра падрыхтавацца да зімовай сесіі і паспяхова здаць экзамены.

М. ПЯТРОВІЧ,
Сталінская стыпендыятка.

Старанна вывучаю марксізм

Асновы марксізма-ленінізма — адна з любімых, вывучаемых мною дысцыплін.

І авалодаць марксісцка-ленінскай навукай я імкнуся глыбока і дасканала.

Для гэтага старанна рыхтуюся да кожнага семінара па марксізму-ленінізму.

Падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў я пачынаю за некалькі дзён да іх правядзення.

Спачатку чытаю і канспектую першакрыніцы, затым выкарыстоўваю брашуры, навуковую і палітычную літаратуру, кнігу «У дапамогу вывучаючым гісторыю ВКП(б)» і іншую літаратуру.

За дзень да заняткаў я прачытваю канспект семінара, прадумваю адказ на кожнае пытанне.

Такая сістэма працы дапамагае мне не толькі добра падрыхтавацца да семінара, але і глыбей зразумець вялікую спадчыну прац класікаў марксізма-ленінізма, якая дапамагае нам у нашай паўсядзённай вучобе і грамадскай працы.

І. СЯРГЕЕЎ,
студэнт першага курса гістфака.

ДАБІЦЦА ПОСПЕХАЎ У ВУЧОБЕ

Днямі на гістарычным факультэце адбылося сумеснае пасяджэнне комсамольскага і прафсаюзнага бюро з шырокім актывам студэнтаў.

На парадку дня стаялі пытанні аб паспяховасці, дысцыпліне і наведванні студэнтамі лекцый.

З дакладам выступіў дэкан факультэта П. З. Савачкін. Ён адзначыў, што хоць агульная паспяховасць і павысілася, на факультэце яшчэ ёсць факты недысцыплінаванасці, некаторыя студэнты прапускаюць лекцыі і семінарскія заняткі.

Выступіўшыя ў спрэчках студэнты Лопан, Малевіч і Несцяровіч далі падрабязную характарыстыку становішча на курсе.

У канцы пасяджэння было прынята разгорнутае рашэнне з распрацоўкай канкрэтных мерапрыемстваў па паляпшэнню дысцыпліны і наведвання лекцый студэнтамі.

І. СІДАРЭНКА.

Практыка дапамагае

На хімічным факультэце зараз многа ўвагі аддаецца практычным заняткам у лабараторыях.

Практычныя заняткі студэнты праводзяць па курсу, які ім чытаецца на лекцыях.

Студэнты-трэцякурснікі, напрыклад, праходзяць практыку па арганічнай хіміі. У лабараторыі кожнаму студэнту трэба сінтэзаваць хаця-б адзін рэактыў з кожнага класа злучэнняў, якія разглядаюцца ў лекцыйным курсе.

Гэта дазваляе больш дэтальна вывучыць уласцівасці арганічных злучэнняў, глыбей зразумець сутнасць арганічных працэсаў, важных для хімічнай прамысловасці.

Практыка дапамагае студэнтам лепш падрыхтавацца да экзаменаў і дазваляе будучаму хіміку прымяніць свае веды ў практычнай рабоце на прадпрыемствах хімічнай прамысловасці.

Ю. БЫЛІНА,
студэнт III курса хімфака.



Цікава праходзяць лекцыі прафесара Т. Н. Годнева па біяхіміі раслін на трэцім курсе біёлага-глебавага факультэта (аддзяленне біялогіі). Пасля чарговай лекцыі Т. Н. Годнева студэнты пад кіраўніцтвам кандыдата біялагічных навук Н. С. Суднік тэарэтычныя веды замацоўваюць на практыцы ў лабараторыі.

На здымку: студэнткі Л. Камінская, А. Асташэвіч, Л. Канаплянік, Г. Малянава на практычных занятках па біяхіміі вызначаюць колькасць цукру ў клетках раслін.

Фота Л. Бондара.

Яшчэ раз аб прагулах

...Аднекуль увесь час цягне халодны ветрык. Вася Трус, студэнт I курса гістарычнага факультэта, варочаецца, стараецца падабраць коўдру. Нарэшце, гэта яму ўдаецца. Вася адчувае, як па ўсім целе разліваецца прыемнае цяпло, і пачынае драмаць. У галаве дзесьці далёка-далёка мільгае думка: «Цікава, колькі гадзін?»

Каб даведацца, колькі гадзін, трэба высунуць галаву з-пад коўдры і зірнуць на гадзіннік: ён цікаў над самай галавой. А вылазіць з цёплай пасцелі Васю не хочацца. У пакоі, мусіць, холадна... Але ўсё-ж трэба паспрабаваць. Трус асцярожна высоўвае руку і тут-жа хавае: пальцы трапілі на ўключаную з вечара электраплітку.

«Ліха на яго...»—Вася злуецца.

«Яшчэ, напэўна, рана. Рэпрадуктар маўчыць»,—думае ён і адварочваецца да сцяны.

Сон паступова зноў апаноўвае яго...

Прачнуўся Трус ад таго, што за дзвярыма нехта затупаў нагамі. Адным махам рукі скінуў на падлогу коўдру і... застыў, аслеплены яркім патокам сонечных праменняў.

— Спазніўся,—разгублена падумаў ён, уключаючы радыё.

«10 гадзін 30 мінут»—пачуў ён голас дыктара.

— Вось дык паспаў! — Трус здзіўлена паглядзеў на чорную талерку рэпрадуктара і хутка зашлёпаў босымі нагамі па пакоі.

У галаве было толькі адно: «Што рабіць? Ісці на лекцыі, ці не?»

Сапраўды, становішча цяжкае. І як вы думаеце, што-ж зрабіў Васіль Трус? Зусім нічога! Ён проста зноў палез пад коўдру і праспаў... яшчэ тры гадзіны.

Выпадак з В. Трусам не адзіны... Ёсць на III курсе аддзялення геалогіі студэнт Г. Осіпаў. На першыя лекцыі ён ніколі не ходзіць і з'яўляецца ва універсітэце толькі ў сярэдзіне дня.

На пытанне, чаму ён позніцца, Осіпаў адказвае (прычым зусім нявінна закрываючы вочы і надаючы свайму твару сумны выраз):

— Трамвай... таварышы. Самі разумееце, жыву на трактарным заводзе.

На другі дзень ён зноў кажа:

— Праспаў, таварышы... Учора позна прыехаў дахаты. Самі разумееце...

Часамі бывае і так: загадзя строіцца план—такія лекцыі наведваць, а такія—не. Па прыклад далёка хадзіць не трэба.

II курс аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Тут вучыцца студэнт Вінаград В. Знешне ён нічым не вылучаецца сярод сваіх аднакурснікаў. Але калі зазірнуць у журнал уліку наведання студэнтамі лекцый, дык прозвішча Вінаграда адразу кідаецца ў вочы. Вінаград прытрымліваецца прынцыпу падзелу лекцый на «важныя» і «не важныя». «Важныя» трэба наведваць, бо па прадметах, якія чытаюцца на гэтых лекцыях, трэба будзе здаваць экзамены. На «не важныя» Вінаград проста махнуў рукой: па іх залікі—здам!

На філалагічным факультэце ёсць яшчэ студэнты, якія ажыццяўляюць прынцып Вінаграда. Штодня або праз дзень яны прапускаюць без уважлівых прычын 1—2 гадзіны. Для прыкладу возьмем студэнтаў IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Комач, Балажынскую, Ідэльсон або студэнтку II курса аддзялення рускай мовы і літаратуры Калеснікаву. Прапускаюць заняткі яны так, каб гэтага ніхто не заўважаў (і асабліва стараста!), па 1—2 гадзіны. Пасядзяць на першай лекцыі, з другой—пойдуць, на трэцюю—прыдуць зноў...

Вось як берагуць вучэбны час студэнты Трус, Осіпаў, Вінаград і іншыя.

Комсамольскім бюро факультэтаў даўно пара паклапаціцца аб тым, каб у студэнцкіх групах не было падобных гультаёў.

А. КІЙРАНЕН
(наш кар.).

Літаратурная старонка

Аляксандр ХАРКЕВІЧ.

ОСЕННИЕ МЕЛОДИИ

МАТЕРИ

Мама, мама,
родная, близкая!
Вот и снова
расстались мы...
...Стынет на небе
солнце низкое
в ледяном
преддверьи зимы.
Ветер листья
срывает редкие
и гоняет
по мостовой.
Клён, сутулясь,
качает ветками—
стариковскою
головой.
Паровозы
кричат простужено,
уносясь
в вечернюю мглу...
...Ты не жди меня,
мама, к ужину,
молчаливо
присев к столу!
Без меня
займись чаепитием,
пересиль
тревоги свои:
я в студенческом
общежитии
пью
студенческие чаи!
И в морозном
дыханьи осени
мне тепло
при мысли одной,
что глазами
небесной просини
ты любовно
следишь за мной.

ЛЮБИМОЙ

То солнце выблеснет—
и день погож;
то лужи выплеснет
на землю дождь;
то даль лазурится,
развеяв тень;
то снова хмурится
осенний день,—
пора туманная,
непостоянная,
то распогожая,
то тьмою тьма,—
как ты, хорошая,
как ты, желанная:
непостижимая,
непостоянная
и всё-ж—
любимая,
как ты сама!

Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

БЕРАЖЫЦЕ ПЕРШУЮ ЛЮБОЎ ...

Беражыце першую любоў!
Беражыце гэты дар адменны!
Страціш—і не вернеш яго зноў,
Страціш—і няма яму замены.
Можа вы палюбіце і зноў,
Калі першая любоў астыне,
Ды не тая будзе ўжо любоў—
Першая жыць будзе ва
ўспаміне.
Першая вас не пакіне, не,
І хадзіць за вамі будзе зданню,
І не раз убачыце вы ў сне
З першаю любімаю спатканне.
Можа, вы палюбіце і зноў,
Калі першая любоў астыне,
Ды не будзе тых гарачых слоў,
Што калісь казалі вы дзяўчыне,
Той не будзе сілы і агня,
І таго бязмежнага задору,
Ад якога-б ты скалу узняў,
Ад якога-б ты варочаў горы.
Беражыце першую любоў,—
Чыстую, як воблака ў блакіце,
Светлую, як сінява палёў—
Як заруку шчасця, беражыце!

* * *

Арсень ЛІС.

Шчабечаш ты, як ластаўка,
Што з выраю вярнулася,
І з шчырай сваёй ласкаю
Ка мне пяшчотна тулішся.
І вочы твае карыя
Прыветна ўсміхаюцца.
Аб іх так доўга марыў я,
І мары вось збываюцца:
Пасля расстання прыкрага
Мы разам сэрцам, думкамі—
Памылкі све выправім
Сягоння пацалункамі.

Ніл ГІЛЕВІЧ.

У БАЦЬКОЎСКІМ КРАЮ

У бацькоўскім краю,
Паміж даўніх сяброў,
Помню ўсмешку тваю,
Погляд, ясны без слоў.
Выйду ўранку зару
Сустракаць за сяло—
Тваіх рук, мілых рук
Прыгадаю цяпло.
Салаўі запяюць
На аселіцы дзесь—
Чую песню тваю,
Зачараваны ўвесь.
Зажурчыць ручаёк—
Аж у сэрцы кальне.
Быццам гэта тваё
Слова ласкі ка мне.
У бацькоўскім краю
Водыр кветак лясных
Я ўдыхаю, я п'ю,
Быццам з вуснаў тваіх.
Ціхі ветрыка лёт.
Што ласкае зямлю.
Як дыханне тваё
Пераймаю, лаўлю.
Прыйдзе зорная ноч.
Цішай дол ахіне—
Сваіх воч, карых воч
Не адводзь ад мяне!
Падымі хоць цяпер
Чорны веер расніц:
Я-ж магу пра цябе
Толькі думаць ды сніць...

Кастусь ЦВІРКА.

СТУДЭНЦКАЕ

Жыў-вучыўся студэнт.
Быў старанны хлапчына ён,
У жыцці вёў адну
Навуковую лінію.
Не вылазіў ён з кніг,
І па скверы, што ў зелені,
Крочыў ён пад руку
Хіба з «Аннай Карэнінай».
Раз дзяўчыну юнак
Стрэў ля лаўкі забытае,
І даўгая каса
Светапогляд заблытала.
Бы ўкапаны, стаяў,
Ды сказаць штось патрапіў ён,
І ўчыніў ён залік
Па яе біяграфіі.
Так дазнаўся пра ўзрост,
Яе працу на трактарным,
І рашыў, што ва ўсім
З ёй сышоўся характарам...
У студэнта сябры
Ў інтэрнаце пытаюцца:
Што ён стаў сам не свой.
Страта сну назіраецца?
На пытанне, як след,
Адказаў тут хлапчына ім,
Што захоплен увесь
Новай ён дысцыплінаю.
Толькі-ж вечарам раз
На свае бачыў вочы ён,
Як з магарам яго
Шчасце вуліцай крочыла.
Што за чорт... Ці-ж даўно
На пытанні сардэчныя
Гаварыла ў адказ,
Што каханне іх вечнае.
І забыла цяпер,
Эх, забыла ўраз яго.
Мусіць, хлопцу тады
Па шпаргалках адказвала.
Ходзіць хмуры студэнт,
І у сэрцы ўвесь дзень яго,
Нібы ў тумбачцы той
Перад самай стыпендыяй.
А назаўтра прышла
Усё-ж дзяўчына здалёк к яму
І прызвала яна
Тут хлопца на калёквіум.
«Ты, чаму не прышоў:
Брат наведаўся з лагераў,
Хоча чарку маёр
Выпіць з будучым швагерам.
Ды і ночы-ж прытым
Сталі гэткія ясныя!
Ты-ж у кнігах сядзіш,
Ну, й зубрылка няшчасная!»
А хлапец: моў, не знаў,
Моў, спрачацца-б не след
так ім!
Словам, плаваў студэнт
На экзамене гэтакім.
Толькі-ж ногі тады,
Здэцца, у свет-бы хлапца вялі,
Нібы ў кніжку яму
«Шэсць» — не меней —
паставілі.
І вось ходзіць, пяе,
І сцвярджае без ліку ён,
Што каханне усё-ж —
Справа вельмі вялікая!

Генадзій БУРАЎКІН

МАРЫ АБ МОРЫ

Я не плаваў у марскіх прасторах,
Хоць душа заўсёды ўдаль заве.
І дзяцінства марамі аб моры
На старонках дзённіка жыве.
А цяпер дзевятым грозным валам
Трызніць стаў і мой малодшы брат.
І цяльняшцы, як і я бывала,
Ён сягоння невыказна рад.
Для яго свой сэнс у тым, што з Мінска
Я цяльняшку гэтую прывёз,
Бо ён знае: там-жа мора блізка —
Чайкі, хвалі аж за край нябёс.
І ён мне пра караблі тлумачыць
З выглядам старога марака
І з кішэні з гордасцю дзіцячай
Дастае партрэт Саманчука.
Загарэлы, хударлявы хлопчык,
На мяне глядзіць ён зараз так,
Што мне ясна і без слоў: ён хоча
Стаць такім-жа, як герой-марак.
І кажу яму я:
— Станеш, мусіць:
Саманчук служыў у горшы час,
Мораў не было на Беларусі,
А цяпер і мора ёсць у нас.

Алесь РЫБАК.

Дзяўчына з дзіцем

— Дайце патрымаць,—так шчыра, проста
Просіць дзеўчынка на рукі ўзяць дзіця.
Хіба-ж хто адмовіць такой просьбе,
Калі столькі ў ёй цяпла і пачуцця!?
Добрая душа у цёці Каці:
Беражліва аддала яна дачку.
Большага няма дзяўчынцы шчасця —
Да малюткі прытуліць шчаку.
Песенкай вясёлаю забавіць,
Чыстаю, дзіцячаю, сваёй,
І не плакаць тут маленькай Тані
Ад харошай песенкі такой.
А дзяўчынцы радасці не змерыць,
Сэрца поўніцца нязнаным пачуццём.
З гэтакай любоўю шчырай, веру,
Пройдзе праз усё яна жыццё.

ШЧАСЛІВАЯ ПАМЫЛКА

(Гумарыстычнае апавяданне)

У пакоі стаяў сапраўдны аўрал: ішла гарачая падрыхтоўка да факультэцкага вечара. Часу заставалася нямнога, і кожны спяшаўся. У дзверы нечакана пастукалі. Валька нерашуча вымавіў: «Уваходзьце!» Але ніхто не ўвайшоў. Потым за дзвярыма пачулася невыразная гаворка і ў той-жа момант... уварваўся Андрэй. Твар яго быў чырвоны, як вячэрняя зара.

— Хлопцы... там,—рука з абутковай шчоткай хутка апісала круг у напрамку дзвярэй і замерла,—там... дзяўчаты!

Валька і я ва ўсе вочы глядзелі на Андрэя: якія дзяўчаты, што ён выдумляе? Ніхто з нас іх не запрашаў. А можа... санкамісія? Я ўпэўнены, што і ў Валькі мільганула гэтая «страшная» думка, бо мы абодвы кінуліся наводзіць парадак у пакоі.

— Ды што вы робіце?—прастагнаў Андрэй і бездапаможна апусціўся на крэсла. —Пра Федзьку, Федзьку пытаюцца... Дзе ён? Хутчэй кажыце, чэрці!

Гэта быў сапраўдны гром з неба, і мы яшчэ больш разгубіліся. Пра Федзьку, нашага таварыша пытаюць... дзяўчаткі! А хіба можа быць такое? Ён-жа аднакурсніц баіцца, а тут... Было чаго здзіўляцца! Але за дзвярыма чакалі. Я ўспомніў, што Федзька і сёння не паддаўся на мае ўгаворы пайсці на факультэцкі вечар і пайшоў з кнігамі ў інстытут. Трэба было прымаць аператыўнае рашэнне, і я вырашыў.

— Вось што, хлопцы, я ведаю дзе ён... Бяру ўсё на сябе... А крывадушныя паводзіны Федзькі Бярозава мы абавязкова абмяркуем і...

Недагладжаны святочны касцюм умомант заняў сваё звычайнае вертыкальнае становішча і я апынуўся на калідоры. Адразу-ж позірк мой упаў на трох дзяўчат—яны стаялі на лесвіцы. Адна з іх падыйшла да мяне. На твары яе—прывабным, з блакітнымі вачыма—свяцілася такая вінавата-мілая ўсмешка, што я не адразу змог сказаць звычайнае «Добры дзень!».

— За турботы—прабачце... Вы таварыш Федзяў?—проста пачала яна.—Тады будзем знаёмы. Я—Таня, Федзя мяне добра ведае, з адной вёскі, ды вучыліся разам... Вы не скажаце, дзе знайсці яго?

— А як-жа, скажу. Вось толькі не ведаў, што ў яго такое прыемнае знаёмства,—весела заўважыў я.—А Федзьку мы знойдзем, хоць на дне марскім... Хадзем.

Мы выйшлі з інтэрната. У глыбокім асеннім небе хітра пераміргваліся зоркі. Паветра, густое, халаднаватае, падбадзёрваючы ласкатала твар. Па дарозе я са здзіўленнем даведаўся, што дзяўчаты—усе трое—зусім не студэнткі, як я думаў, а работніцы швейнай фабрыкі. Таня ішла побач, і я стараўся як мага больш даведацца пра яе, пра яе знаёмства з таварышам. Дзяўчына ахвотна адказвала на мае пытанні. Высветлілася, што Федзя некалькі разоў запрашаў яе нават у тэатр, а цяпер —на факультэцкі вечар. «Вось табе і ціхоня»,—думаў я пра Федзьку.—«Не сказаць нікому ніводнага слова, нават мне, блізкаму таварышу... А як ён падсмейваўся з мяне, калі я ў Верачку Вярбіцкую закахаўся!»

Інстытут быў недалёка, і праз некалькі хвілін мы ўжо стаялі ў вестыбюлі. Я прапанаваў дзяўчатам пачакаць, а сам паімчаўся па лесвіцы на трэці паверх.

Вось і хімічная лабараторыя—пастаянное Федзькава месцазнаходжанне. Я ціханька прыадчыніў дзверы—у нос рэзка ўдарыў пах серы, а паміж двух вялізных колб важна тырчэла Федзькава чубатая галава.

— Калега,—пачаў я строгім голасам,—я прышоў да вас, каб паведаміць...

Федзя ўмомант падняў галаву і, убачыўшы мяне, весела рассмяяўся. Іншым разам я ахвотна падтрымаў-бы яго, але цяпер гэта яшчэ больш раззлавала мяне.

— Слухай, кідай гуляць у дурня — ты падводзіш і сябе і нас. Запрашаеш гасцей, дык будзь добрым і сустракай іх, няма чаго!

— Ты што, каго сустракаць?—здзівіўся ён.—Я не разумею... Можа бабулька прыехала?

— Ты угадаў: бабулька... па імені Таня! Яна?

Але і гэта не збянтэжыла Федзьку—ён па-ранейшаму ўсміхаўся. Мне заставалася адно—хутчэй выканаць сваю місію «праваднiка».

— Цябе чакаюць унізе дзяўчаты,—падкрэсліваў я кожнае слова.—Не прабуй супраціўляцца. Хадзем зараз-жа...

Федзька ўжо не ўсміхаўся. Тое, што я сказаў, відаць, зрабіла на яго ўражанне. Ён паслухмяна пайшоў за мной, а я пра сябе злараднічаў: «Вось так, братка, так... Зараз мы убачым тваю сапраўдную ўсмешку».

У вестыбюлі было поўна студэнтаў—набліжаўся час пачатку мастацкай самадзейнасці. Паўсюдна чуўся вясёлы гоман, смех. Дзяўчат я заўважыў ля стэнда, прысвечанага Адаму Міцкевічу. Яны разглядалі ілюстрацыі.

— Дзяўчаткі, замрыце: наш вялікі хімік перад вамі,—прамовіў я і з велічным паклонам адступіў убок.

Дзяўчаты азірнуліся. Таня здзіўлена глянула на Федзю, потым на мяне і, раптам пачырванеўшы, збянтэжана запытала:

— А хто... гэта?

— Як хто?—у сваю чаргу здзівіўся я.— Ваш знаёмы, мой таварыш, Фядот Іванавіч...

— Ой, дзяўчаткі,—раптам усклікнула Таня,—дык гэта-ж... Фядот, ды не той!

Танін твар пажвавеў і ў вачах, па-дзіцячаму акругленых, заіскрыліся вясёлыя агеньчыкі. Усе глядзелі на мяне, а я... Нечаканая здагадка разагнала ўсю маю развязнасць і я няроўным голасам запытаў:

— А ён, знаёмы ваш, з якога факультэта?

— З гістарычнага...

Усё стала зразумелым: дзяўчатам патрэбен быў Федзька-гісторык, наш сусед па пакоі... Секунда, другая і дружны смех замяніў напружанае маўчанне, весела зазвінеў вакол зусім разгубленага Федзі...

... Пасля вечара, калі святло ў нашым пакоі пагасла і хлопцы заснулі моцным сном, скрозь дрымоту я нечакана пачуў ціхі Федзяў голас:

— Ты спіш, Жэнька? Спіш, не?

Я з намаганнем адплюшчыў вочы і прыўзняўся:

— Эх, Жэнька, якая дзяўчына гэтая Таня! Я-ж увесь вечар танцаваў з ёю... Ра-зу-мееш?

Федзька схапіў маю руку і сціснуў яе гарачым поціскам.

Я. КАРШУКОЎ.

АТ 06765 Мінск. Друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Зак. 792. Тыр. 2 000. РЭДАКТАР А. ВОЛК.